УДК 94(476.5)“1923/1924”:352.075:316.343

# Адносіны мясцовага насельніцтва і павятовых улад да змены адміністрацыйнай прыналежнасці тэрыторыі Віцебскай губерні ў 1923–1924 гг.

**Бараноўскі А.В.**
***Дзяржаўная навуковая ўстанова “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, Мінск***

*У маі 1923 г. ЦК РКП(б) разгледзеў пытанне аб межах БССР і даў згоду на яго далейшую распрацоўку. Менавіта з гэтага часу пачалася актыўная дзейнасць па вяртанні ўсходнебеларускіх зямель у склад БССР. На месцах шырока абмяркоўвалася дадзенае пытанне.*

*Мэта – вызначэнне адносін мясцовага насельніцтва і павятовых улад да дзяржаўнай прыналежнасці тэрыторыі Віцебскай губерні ў 1923–1924 гг.*

***Матэрыял і метады.*** *Крыніцамі пры напісанні артыкула сталі дакументы, выяўленыя падчас працы ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці, матэрыялы, апублікаваныя ў віцебскай губернскай газеце “Известия Витебского губисполкома и губкома РКП(б)”. Даследаванне абапіраецца на агульнанавуковыя і традыцыйныя гістарычныя метады, такія як гісторыка-сістэмны і гісторыка-тыпалагічны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *З найбольшым энтузіязмам да пашырэння БССР аднеслася беларуская інтэлігенцыя. Настаўнікі, работнікі адукацыйных і культурных устаноў пачынаючы з 1923 г. віталі далучэнне да Беларускай рэспублікі. Што тычыцца працоўных і сялян, то большасць з іх у 1923 г. выступала супраць далучэння. Іх турбавала, што аб’яднанне з БССР адмоўна адаб’ецца на матэрыяльным становішчы. Праз год рабочыя і сяляне ўспрынялі ўзбуйненне БССР як факт, які адбыўся, бо разумелі, што ўсе рашэнні былі прынятыя ў Цэнтры і іх не змяніць.*

***Заключэнне.*** *Аналіз крыніц дазволіў сфарміраваць уяўленне аб адносінах мясцовага насельніцтва і павятовых улад да дзяржаўнай прыналежнасці тэрыторыі Віцебскай губерні ў 1923–1924 гг.*

***Ключавыя словы:*** *Віцебская губерня, узбуйненне БССР, ячэйкі РКП(б), сялянскія канферэнцыі.*

*(Ученые записки. – 2018. – Том 26. – С. 7–11)*

# Attitude of the Local Population and the County Authorities to the Substitution of Administrative Ownership of the Territory of Vitebsk Province in 1923–1924

**Baranovsky A.V.**
***State Scientific Institution “Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus”, Minsk***

*In may 1923 the Central Committee of the RCP(B) considered the issue of the BSSR borders and agreed to its development. Since that time, active work began on the return of Eastern Belarusian lands into the BSSR. The issue was actively discussed locally. The article is devoted to the attitude of the local population and the county authority to the state ownership of the territory of Vitebsk Province in 1923–1924.*

*The purpose of the article is to determine the attitude of the local population and the county authorities to the state ownership of the territory of Vitebsk Province.*

***Material and methods.*** *The sources when writing the article were archival documents revealed during our work in the State Archive of Vitebsk Region, articles published in Vitebsk Province newspaper “News of Vitebsk Provincial Executive Committee and Provincial Committee of RCP(B)”. The research is based on traditional historical methods, such as historical-systematic and historical-typological. General scientific methods are also used.*

***Findings and their discussion.*** *Belarusian intellectuals were most enthusiastic about the expansion of the BSSR. Teachers, workers of educational and cultural institutions, welcomed the inclusion into the Belarusian Republic since 1923. As for workers and peasants, most of them in 1923 opposed the accession. They were worried that the union with the BSSR would negatively affect their financial situation. A year later workers and peasants perceived the expansion of the BSSR as a fait accompli, as they understood that all decisions were taken at the Center and they could not be changed.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* sasha9209@mail.ru – **А.В. Бараноўскі**

***Conclusion.*** *The analysis of the sources made it possible to shape an idea of the attitude of the local population and the county authorities to the state ownership of the territory of Vitebsk Province in 1923–1924.*

***Key words:*** *Vitebsk Province, enlargement of the BSSR, sections of the RCP(B), peasant conferences.*

*(Scientific notes. – 2018. – Vol. 26. – P. 7–11)*

З 1923 г. ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР усё больш настойліва ставілася ў саюзных органах пытанне аб вяртанні ў склад рэспублікі тэрыторый, страчаных у гады грамадзянскай вайны. У маі 1923 г. ЦК РКП(б) вырашыў пашырыць межы Савецкай Беларусі за кошт сумежных раёнаў Расіі з большасцю беларускага насельніцтва. Для падрыхтоўкі прапаноў аб змяненні межаў БССР Аргбюро ЦК РКП(б) стварыла адмысловую камісію, а на месцах пачало актыўна абмяркоўвацца дадзенае пытанне.

Мэта – вызначэнне адносін мясцовага насельніцтва і павятовых улад да дзяржаўнай прыналежнасці тэрыторыі Віцебскай губерні ў 1923–1924 гг.

**Матэрыял і метады.** Пры напісанні артыкула выкарыстоўваліся дакументы, выяўленыя падчас працы ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці, матэрыялы, апублікаваныя ў віцебскай губернскай газеце "Известия Витебского губисполкома и губкома РКП(б)" [1–19]. Пры гэтым ужываліся агульнанавуковыя (апісанне, аналіз, сінтэз і г.д.) і спецыяльныя метады гістарычнай навукі (гісторыка-сістэмны і гісторыка-тыпалагічны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Вяртанне ў склад БССР усходнебеларускіх тэрыторый сустрэла неадназначную рэакцыю як у далучаных раёнах, так і за межамі рэспублікі. З лета 1923 г. у Віцебскай губерні на агульнагарадскіх сходах і валасных канферэнцыях, пасяджэннях валасных ячэек і сходах сялян, школьных канферэнцыях і сходах настаўнікаў абмяркоўвалася беларускае пытанне. У лютым-сакавіку 1924 г. пачалася новая хваля абмеркавання, аднак яна была менш радыкальнай, далучэнне да БССР успрымалася як факт, які ўжо адбыўся.

На падставе архіўных дакументаў мы паспрабавалі высветліць, як насельніцтва Віцебскай губерні адносілася да стварэння беларускіх школ, да ўвядзення беларускай мовы ў дзяржаўных установах і, нарэшце, як яно глядзела на далучэнне да Беларусі. Атрыманыя матэрыялы намі былі выкарыстаныя з такім разлікам, каб высветліць стаўленне мясцовага насельніцтва да ўсіх пытанняў, якія нас цікавяць, асобна з пункту погляду камуністаў-беларусаў, беларускай інтэлігенцыі, беларускага сялянства ў 1923–1924 гг.

У 1923 г. аб'яднанае пасяджэнне ячэек РКП(б) Першамайскай воласці Полацкага павета выказвалася, што ўвядзенне заняткаў у школах і ва ўстановах на беларускай мове з'яўляецца не вызваленнем нацыі, а яе прыгнётам, бо насельніцтва абсалютна не мае паняцця пра беларускую мову і наогул ставіцца адмоўна да далучэння да Беларусі. Сход пастанавіў: "хадайнічаць перад губкамам РКП аб недапушчэнні змяненняў у нацыянальным пытанні" [1, арк. 111–113].

На агульным сходзе Гарадоцкай гарадской ячэйкі Віцебскага павета былі выказаны наступныя думкі: "Хоць сяляне сябе называюць беларусамі, але ўсё ж такі чыста беларускую мову яны не разумеюць. Затое добра разумеюць рускую мову, таму неабходнасці ў аддзяленні няма". Гэта пацвердзіла выступленне Зарэцкага: "Я прывяду вам маленькі прыклад: у мінулым годзе тут быў Пшчалко, які выступаў сярод сялян і гарадскога насельніцтва на беларускай мове, і яго амаль ніхто не зразумеў". У выніку сход прыйшоў да высновы, што нацыянальнай самасвядомасці ў беларусаў воласці няма і таму няма патрэбы ў школах на беларускай мове [2, арк. 20–20 аб.].

У Віцебскім павеце на сходзе Астровенскай валасной ячэйкі сумесна з ячэйкай РКП(б) і беспартыйнымі было таксама выказана адмоўнае стаўленне да беларускай мовы і культуры. Толькі адзін беспартыйны Шпунт заявіў пра пажаданасць увядзення выкладання на беларускай мове ў школах 1-й ступені. Але іншы беспартыйны Букштынаў запярэчыў яму: "Калі ўвесці беларускую мову, тады мне будзе трэба вучыцца нават з жонкай размаўляць". Таксама шэраг беспартыйных сялян выказаўся супраць усялякіх далучэнняў да Беларусі: "Савецкая ўлада нам дорага, а назвы нам абыякавыя, быццам Беларуская рэспубліка або Украінская" [3, арк. 33 аб.].

Агульны сход ячэйкі воднага транспарту г. Віцебска пастанавіў: "У Савецкай Расіі поўная свабода нацыянальнай роўнасці, імкненне Віцебскай губерні да г. Мінска не назіраецца, бо беларускай мовы ніхто не ведае" [4, арк. 57].

У 1924 г. стаўленне камуністаў-беларусаў да далучэння да БССР змянілася. У справаздачы Бачэйкаўскага павятовага камітэта РКП(б) за сакавік-красавік 1924 г. адзначалася: "У настроі працоўных прасочвалася нейкая прыгнечанасць у сувязі з пераходам да Беларусі і будучым скасаваннем павета. Баяліся таксама абавязковага ўвядзення беларускай мовы. Цяпер настрой палепшыўся" [5, арк. 30]. На агульным сходзе ячэйкі РКП(б) і РКСМ фабрыкі "Чырвоная зорка" Бачэйкаўскага павета былі выказаны такія думкі: "Беларусы калісьці былі таксама вялікай самавызначальнай нацыяй, але, знаходзячыся пад заваёвамі, яна як бы раз'ядналася. Частка беларусаў знаходзіцца ў Польшчы, частка ў Расіі, а вось у цяперашні час адбываецца ўзбуйненне Беларусі" [6, арк. 14]. Падчас агульнага сходу членаў РКП(б) і РКСМ Бачэйкаўскай гарадской арганізацыі Шадурскі выказаўся, што для ўзбуйнення Беларусі было дзве прычыны: адна палітычная, другая эканамічная. Падрабязна патлумачыўшы эканамічнае прыцягненне да ўзбуйнення Бела-

русі, ён адзначыў, што палітычныя прычыны з'яўляюцца больш магутнымі і галоўнымі пры ўзбуйненні. Часова дасланы з Цэнтра ў павет А.М. Асаткін даказваў цытатамі з прамоў Леніна, сказаных ім у 1915 г., што "беларусы маюць вялікае значэнне як самастойная нацыя" [7, арк. 5].

На агульным сходзе ячэйкі № 13 Дома Саветаў г. Оршы было пастаўлена пытанне аб далучэнні Віцебскай губерні да Беларусі. На думку прысутных дадзенае пытанне мела прынцыповы характар (асабліва ўлічвалася тое, што ў Цэнтры яно вырашана станоўча): "наша задача падрыхтаваць да дадзенага пераходу насельніцтва". У выніку сход прыняў наступную пастанову: "…агульны сход ячэйкі адабрае рашэнне з'езда аб далучэнні Віцебскай губерні да БССР" [8, арк. 1–1 аб.]. На агульным сходзе Смальянскай ячэйкі РКП(б) Аршанскага павета адзначалася: "Прыгнечаныя народы павінны карыстацца самастойнасцю. Беларусь самастойна арганізавалася 31 снежня 1918 г. Ішла вайна, тады ўся ўвага была ўдзелена фронту. Калі сціхла вайна, паўстала пытанне аб вызначэнні ўзбуйнення Беларусі, з'явілася неабходнасць пашырэння тэрыторыі. Дадзенае пытанне павінна быць разгледжана са станоўчага боку" [9, арк. 23–23 аб.].

Агульны сход Дрысенскай гарадской ячэйкі РКП(б) Полацкага павета пастанавіў: "Узбуйненне Беларусі мае палітычнае значэнне для нас, якое паказвае нашым замежным таварышам, што нацыянальнага прыгнёту народа ў нас няма. Перад намі стаяць наступныя задачы: падняць прамысловасць, працу і асвету" [10, арк. 25].

Стаўленне мясцовай інтэлігенцыі, галоўным чынам настаўнікаў, моцна адрознівалася ад поглядаў камуністаў-беларусаў. Настаўнікі ўжо ў 1923 г. актыўна падтрымлівалі аб'яднанне з Беларуссю.

На сходзе школьных работнікаў у г. Віцебску Сухарукаў адзначаў: "Адной толькі моўнай прыкметы недастаткова для таго, каб судзіць аб тым, што Віцебская губерня не адносіцца да Беларусі. Адзінай беларускай мовы няма, яна рэзка распадаецца на шэраг дыялектаў. Асабліва моцная розніца ва ўсходнім і паўднёвым дыялектах. Этнаграфічна, гістарычна і эканамічна Беларусь мае ўсе падставы да адраджэння і нават да зараджэння. Для пашырэння і эканамічнага росквіту Беларусь мае ў наяўнасці ўсе дадзеныя. Беларуская культура была ў загоне, зараз мы перажывём Ламаносаўскі перыяд". Васілеўскі ў сваю чаргу адзначаў, што "школа, калі мы хочам паставіць яе правільна, павінна насіць характар гэтай культуры. Мова беларуская, як матчына, павінна адыгрываць у школе вялікую ролю".

Падчас сходу гучалі і цалкам супрацьлеглыя выказванні: "Не зразумее наш віцебскі беларус беларускай мовы. Не трэба яна яму". "Да Масквы, а не да Мінска імкнецца віцебскі селянін. Самі сяляне не любяць беларускай мовы".

Актыўна вялося абмеркаванне па беларускім пытанні на сходзе грамадска-палітычнага гуртка школьных работнікаў у Гарадоцкай воласці. Думкі прысутных падзяліліся. Адны казалі, што "нацыянальнай самасвядомасці няма. Антаганізму з велікарусамі не заўважаецца... Беларуская мова аджывае нават у глухой вёсцы. Калі беларускую мову зрабіць пануючай у школе, то селянін адмовіцца адпраўляць сваіх дзяцей у школу. Беларусамі лічымся толькі па тэрыторыі, але не па нацыянальнай самасвядомасці. Нацыянальныя рысы беларускага народа зніклі, і іх няма патрэбы аднаўляць".

Іншыя ім пярэчылі: "Нельга пахаваць беларускую мову. Практыка паказвае, што гэтай мовай карыстаюцца, і яна можа прыжыцца з поспехам, калі яе ачысціць ад усялякіх прымесей і ўзяць чыстую беларускую мову. П'есы на беларускай мове маюць вялікі поспех сярод сялян". Адзін з прамоўцаў адзначаў, што трэба вывучаць мову, імкнучыся да добраахвотнага і свабоднага супрацоўніцтва з Беларуссю. "Беларуская мова падабаецца насельніцтву, і яе можна ўводзіць у школах як дапаможную". Частка школьных работнікаў Аршанскага павета таксама імкнулася да Мінска, беларускай культуры і мовы [1, арк. 111–113].

На агульнагарадскім сходзе членаў прафсаюзаў школьных работнікаў, членаў РКП(б) і РКСМ і прыватных грамадзян Лепельскага павета прамоўцы ў большасці сваёй выказваліся, што беларускае пытанне "дутае, што статыстычныя дадзеныя недакладныя, што няма эканамічных перадумоў для далучэння да Беларусі". Аднак з выступоўцамі не пагаджаўся Рычкоў, які звярнуў увагу прысутных на тое, што "насельніцтва імкнецца да Беларусі, ведае беларускую мову і шмат часу размаўляе на ёй. Літаратурная беларуская мова, як і літаратурная велікаруская мова, далёкая ад народнай мовы. Эканамічна наш павет імкнецца да Мінска". Але ў выніку была прынятая наступная рэзалюцыя: "Беларускае пытанне ў нашым павеце з'яўляецца несвоечасовым і нежыццёвым. Сярод насельніцтва не маецца прыцягнення да аддзялення ад велікарускай культуры; ніякага велікарускага прыгнёту няма, наадварот, увядзенне беларускай мовы ў школах і ўстановах было б свайго роду нацыянальным прыгнётам, бо насельніцтва беларускай мовы не ведае" [11, арк. 88].

Пераважная маса сялянства губерні адносілася адмоўна да ўвядзення беларускай мовы ў школах і ўстановах і далучэння да Беларусі. У прыватных гутарках з сялянамі па беларускім пытанні яны выказвалі здзіўленне, што гэтае пытанне раптам ні з таго, ні з гэтага паўстала.

На сходзе грамадзян Усць-Далыскай воласці Невельскага павета ўсе выступоўцы аднадушна выказваліся супраць увядзення беларускай мовы. Цюрынаў заявіў: "Мне ў перыяд грамадзянскай вайны давялося пабываць ва ўсіх амаль гарадах і мястэчках Савецкай рэспублікі, быў на Украіне і ў Беларусі, ніхто з нашых Віцебскіх таварышаў не разумеў і зусім не мог чытаць беларускіх газет і кніг". Міронаў адзначаў: "Мы не можам лічыць сябе беларусамі, бо беларуская мова нам незнаё-

мая, і калі яна з'явіцца ва ўстановах, то для нас гэта будзе цяжкім". Каваленка: "Мы рускія, хоць край наш і лічыцца нібыта беларускім, але мы далёка адсталі і ніхто з нас не можа быць беларусам". Усё падсумаваў Жаўнераў: "На беларускай мове наш народ не ўмее гаварыць, калі ж ва ўстановах з'явіцца беларуская мова, то тады наш народ будзе хваляваццa, мы рускія і павінны заставацца рускімі". У выніку сход пастанавіў: "Аднагалосна заяўляем, што калі нашы далёкія продкі і былі беларусамі, але мы цяпер сябе па мове лічым рускімі, і чыстая беларуская мова нам дрэнна зразумелая, а таму жадаем застацца ў далейшым у межах Вялікаросіі і на далучэнне да Беларусі не згодныя" [11, арк. 79].

Сяляне Веліжскага павета адзначалі: "Мы гаворым на той жа мове, што і сяляне суседняй Смаленскай губерні, але гаворку насельніцтва з Мінскай губерні разумеем". Што тычыцца школы, то яны лічылі, што выкладанне павінна весціся на той жа мове, што і да гэтага часу. Яны былі супраць увядзення беларускай мовы ў савецкіх установах, бо асцерагаліся, што гэта выкліча для іх цяжкасці ў стасунках з уладай.

На раённай канферэнцыі ў Лаўжанскай воласці Віцебскага павета сяляне заявілі: "Мы хоць і належым да Беларусі, але па той прычыне, што ў нас школы пабудаваны на вялікарускай мове, то мы жадаем застацца па-ранейшаму" [1, арк. 111–113]. А на іншай канферэнцыі той жа воласці, пры абмеркаванні, да якой нацыі грамадзяне згодныя далучыцца – да беларускай або вялікарускай, было вырашана "цалкам далучыцца да беларускай нацыі" [12, арк. 12].

Падчас пасяджэння Каралеўскага валвыканкама Віцебскага павета школьны работнік Дарожкін выказаўся, што стварэнне школы на беларускай мове не дасць ніякіх лепшых суцяшэнняў. "Нас саміх амаль усіх варта перавыхаваць, а ўжо дзяцей тым больш, бо яны не атрымліваюць першапачатковай гаворкі на беларускай мове да паступлення ў школы, так што пераход да беларускай мовы зусім не патрэбны". Сазонаў наогул заявіў пра тое, што беларуская мова зусім не патрэбная, каб цалкам не заблытаццa не толькі ў пісьме, але нават і ў размове. Пасля абмеркаванняў была вынесена наступная пастанова: "Прымаючы да ўвагі, што наша Каралеўская воласць страціла ўсякае беларускае аблічча, расце, квітнее на вялікарускай культуры на зразумелай мове. Таму неабходна лічыць Каралеўскую воласць вялікарускай і выказацца за далучэнне яе да Масквы" [11, арк. 82].

Сяляне Дабрамыслінскай воласці Віцебскага павета сцвярджалі, што яны аднолькава добра разумеюць вялікарускую і беларускую мовы, у школах і ўстановах просяць пакінуць рускую мову, але жадаюць мець хаця б адну школу на воласць з выкладаннем на беларускай мове, таксама жадаюць застацца ў складзе Віцебскай губерні [1, арк. 111–113].

На з'ездзе Саветаў Першамайскай воласці Полацкага павета прысутнічала каля 200 сялян. Кожны з прысутных меў уласнае меркаванне. Іваноў: "Нашы прадзеды калісьці былі беларусамі, а ў цяперашні час ніхто не мае ўяўлення пра тое, што такое беларус і беларуская мова... Далучэнне да Беларусі прывядзе толькі да прыгнёту па вывучэнні беларускай мовы, засваення чужых для нас бытавых умоў". Мацко: "Мы лічым сябе беларусамі, і калі гэта вышэйшай уладзе будзе заўгодна, дык няхай далучаць да Беларусі". Піятровіч: "Мы беларускай мовы не ведаем, і ні да якой Беларусі далучаццa не хочам". З'ездам была прынятая наступная пастанова: "Нягледзячы на тое, што жыхары Віцебскай губерні лічацца беларусамі, яны ўжо даўно згубілі сваю самабытнасць, і беларуская мова з'яўляецца для іх чужой. Сярод насельніцтва ніякага прыцягнення да Беларусі няма, вывучэнне беларускай мовы, стварэнне беларускіх школ і ўвядзенне гэтай мовы ва ўстановах з'яўляецца ломкай усяго ладу народнага жыцця, а таму з'езд знаходзіць гэта непажаданым і немэтазгодным і ад далучэння да Беларусі адмаўляецца" [11, арк. 85 аб.].

На нарадзе райсаветаў у Бухарынскай воласці аднагалосна выказаліся супраць увядзення беларускай мовы ў школах і ўстановах, супраць далучэння да Мінска.

Іншая карціна склалася на з'ездзе Саветаў Калінінскай воласці Полацкага павета. Шыркевіч: "Для нас беларуская мова зусім непрыдатная, бо ніхто ў дадзенай мясцовасці яе не ведае. Калі з нас хто-небудзь возьмецца чытаць беларускую літаратуру, то яна яму здаецца «кітайскай азбукай»". Лоўкін: "Для нас у дадзены час беларуская мова зусім не падыходзіць. Яе можа вывучаць толькі новае і маладое пакаленне". Рабытко: "Для нас беларуская мова зусім непрыдатна, мы яе не ведаем і не хочам уводзіць яе ў нашай мясцовасці і далучацца да Беларусі". Але падчас наступных выступленняў прамоўцы ўжо не былі такімі катэгарычнымі. Шыркевіч у другім выступе сцвярджаў: "Усе нацыі самавызначаюцца, і мы таксама жадаем самавызначыцца і вывучаць беларускую мову, неабходна Беларусь уводзіць у гісторыю". Патрэбка заявіў: "Для нас беларуская мова прымальная і ўвядзення яе ў дадзенай мясцовасці мы хочам". Лоўкін адзначыў, што частка школ будзе на рускай мове і "калі мы далучымся да Беларусі, жадаючыя змогуць вучыцца і ў рускай школе". Пры галасаванні з'езд невялікай большасцю галасоў прызнаў неабходным увядзенне ў дадзенай мясцовасці ў школах і ўстановах беларускай мовы і выказаўся за далучэнне да Беларусі.

У Аршанскім павеце былі праведзены валасныя сходы ў Старасельскай, Талачынскай і Нова-Тухінскай валасцях і адзін вясковы сход у Каханоўскай воласці. Сяляне заяўлялі, што здаўна лічаць сябе беларусамі, але яны супраць далучэння да Беларусі. На беларускай мове яны не ўмеюць гаварыць, толькі частка старых добра разумее яе [1, арк. 111–113].

На сходзе сялян Пышнянскага раёна Лепельскага павета выказваліся розныя меркаванні адносна прыналежнасці Віцебскай губерні і ўжывання беларускай мовы. Чашнінскі ўказаў на незразумеласць беларускай мовы для самога насельніцтва. Кныпалаў – на нязручнасць гэтай мовы, а другі Кныпалаў сцвердзіў добрае размяшчэнне губерні і зручнасць злучэння з Беларускай рэспублікай, бо Мінск як цэнтр значна бліжэй Масквы. Прысутнымі выказвалася жаданне мець школы на беларускай мове. Сход не даў дакладных адказаў на ўсе пастаўленыя пытанні, ён адбываўся занадта сумбурна. Адказ быў адзін: "Жадаем быць беларусамі" [11, арк. 89]. На сходзе сялян у вёсцы Бароўна Лепельскай воласці была прынята пастанова: "Пэўнага яснага ўяўлення аб далучэнні нас да Мінска ці да Масквы мы не маем. Мова для нас як беларуская, так і руская аднолькава зразумелая" [11, арк. 90].

У 1924 г. стаўленне мясцовых сялян, як і камуністаў-беларусаў, змянілася ў адносінах да далучэння да БССР. У пачатку сакавіка 1924 г. у Кандрацьеўскім раёне Віцебскага павета адбыўся раённы сход. Па дакладзе аб узбуйненні Беларусі пастаноўлена прызнаць палітыку Савецкай улады правільнай, а ўзбуйненне Беларусі лічыць своечасовым, пажаданым і вітаць [13, с. 3]. На агульным сходзе грамадзян Вораўскага райсавета Кузняцоўскай воласці Віцебскага павета была прынята наступная пастанова: "Вітаем Беларускую рэспубліку і абяцаем беларускаму ўраду дапамагаць наяўнымі ў нас сродкамі ў стварэнні моцнай Беларусі" [14, арк. 18–18 аб]. Па дакладзе аб узбуйненні Беларусі на сялянскай беспартыйнай канферэнцыі ў Каралеўскай воласці Віцебскага павета было вырашана: "Прызнаць важным гістарычным актам далучэнне да Беларусі… Гэта таксама дасць магчымасць прыгнечанаму беларускаму народу, які знаходзіцца па той бок меж СССР, імкнуцца да аб'яднання з вольным беларускім народам СССР" [15, арк. 1]. Сялянская канферэнцыя Унішэўскай воласці Віцебскага павета вітала ўзбуйненне Беларусі, "якое падымае аўтарытэт савецкага ладу сярод прыгнечаных нацыянальнасцей і якія даюць свабоду культурнага і гаспадарчага развіцця кожнай народнасці" [16, арк. 9].

У Аршанскім павеце неаднаразова праводзіліся сходы і гутаркі з нагоды далучэння да Беларусі. Сяляне спачувальна ставіліся да далучэння, але не разумелі беларускай літаратурнай мовы. На з'ездзе райсаветаў была вынесена рэзалюцыя з прапановай урадам БССР і СССР накіраваць усе намаганні для таго, каб "вырваць з-пад прыгнёту Польшчы тэрыторыю, на якой жывуць беларусы" [17, арк. 22].

Падчас Дрысенскай валасной беспартыйнай сялянскай канферэнцыі Полацкага павета ішло абмеркаванне лёсу Віцебскай губерні. Майсееў адзначыў, што "ўзбуйненне Беларусі з'яўляецца вынікам нацыянальнай палітыкі Савецкай улады, якая прадстаўляе кожнай народнасці поўную свабоду нацыянальнага, палітычнага і эканамічнага развіцця. Да цяперашняй Беларусі, якая складаецца з шасці паветаў Мінскай губерні, далучаюцца частка Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў, менавіта тыя часткі, якія ў большасці населеныя беларусамі. Пры гэтым далучэнні тэрыторыя Беларусі больш чым падвойваецца і становіцца роўнай тэрыторыі прыкладна заходняй дзяржавы – Бельгіі. Гэта далучэнне мае вялікае значэнне. Усе беларусы атрымліваюць магчымасць развіваць агульнымі сіламі сваю культуру, прамысловасць і гаспадарку, якія на ўсёй тэрыторыі маюць аднастайны выгляд і характар" [18, арк. 1 аб.–2]. На Шырокай сялянскай канферэнцыі ў Сямёнаўскай воласці Полацкага павета сяляне заявілі аб неабходнасці далучэння да Беларусі, а таксама выказаліся за ўвядзенне ў школах выкладання беларускай мовы [19, арк. 7 аб.].

Падчас агульнага сходу грамадзян Суражскай воласці Веліжскага павета Грыгор'еў адзначыў, што "далучэнне да Беларусі не з'яўляецца гвалтоўным, навучанне ў школах будзе па-ранейшаму на нашай жа рускай мове". У выніку гэты сход прыняў рэзалюцыю: "Хадайнічаць перад вышэйшымі ўладамі аб далучэнні да Беларусі ўсяго Веліжскага павета" [20, арк. 37].

**Заключэнне.** Такім чынам, з найбольшым энтузіязмам да ўваходжання Віцебскай губерні ў склад БССР аднеслася мясцовая інтэлігенцыя. Настаўнікі, работнікі адукацыйных і культурных устаноў пачынаючы з 1923 г. віталі далучэнне да Беларускай рэспублікі. Што тычыцца працоўных і сялян, то большасць з іх у 1923 г. выступала супраць далучэння да БССР. Іх турбавала, што ўваходжанне ў склад Беларускай рэспублікі адмоўна адаб'ецца на матэрыяльным становішчы. Праз год рабочыя і сяляне ўзбуйненне БССР успрынялі як факт, які адбыўся, бо разумелі, што ўсе рашэнні былі прынятыя ў Цэнтры і іх не зменяць.

## Літаратура

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 10050-п. – Воп. 1. – Спр. 629.
2. ДАВВ. – Ф. 10117-п. – Воп. 1. – Спр. 11.
3. ДАВВ. – Ф. 10064-п. – Воп. 1. – Спр. 218.
4. ДАВВ. – Ф. 10055-п. – Воп. 1. – Спр. 72.
5. ДАВВ. – Ф. 10067-п. – Воп. 1. – Спр. 339.
6. ДАВВ. – Ф. 10067-п. – Воп. 1. – Спр. 370.
7. ДАВВ. – Ф. 10067-п. – Воп. 1. – Спр. 372.
8. ДАВВ. – Ф. 10065-п-ААФ. – Воп. 1. – Спр. 543.
9. ДАВВ. – Ф. 10121-п. – Воп. 1. – Спр. 10.
10. ДАВВ. – Ф. 10118-п. – Воп. 1. – Спр. 12.
11. ДАВВ. – Ф. 10050-п. – Воп. 1. – Спр. 624.
12. ДАВВ. – Ф. 10064-п. – Воп. 1. – Спр. 216.
13. Известия Витебского губисполкома и Губкома РКП(б). – 1924. – 16 марта. – С. 3.
14. ДАВВ. – Ф. 24. – Воп. 1. – Спр. 30.
15. ДАВВ. – Ф. 10052-п. – Воп. 1. – Спр. 17.
16. ДАВВ. – Ф. 10033-п. – Воп. 1. – Спр. 7.
17. ДАВВ. – Ф. 10065-п-ААФ. – Воп. 1. – Спр. 546.
18. ДАВВ. – Ф. 10118-п. – Воп. 1. – Спр. 7.
19. ДАВВ. – Ф. 10128-п. – Воп. 1. – Спр. 1.
20. ДАВВ. – Ф. 10131-п. – Воп. 1. – Спр. 11.

*Паступіў у рэдакцыю 08.02.2018 г.*